*М. Л. Кузьмініч*

# ПРАБЛЕМЫ КАДРАВАГА ЗАБЕСПЯЧЭННЯ І ПАДРЫХТОЎКІ СПЕЦЫЯЛІСТАЎ ДЛЯ САЦЫЯЛЬНА-КУЛЬТУРНАЙ СФЕРЫ Ў БЕЛАРУСКІМ ДЗЯРЖАЎНЫМ УНІВЕРСІТЭЦЕ КУЛЬТУРЫ І МАСТАЦТВАЎ

Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў — вядучая вы- шэйшая навучальная ўстанова ў нацыянальнай сістэме адукацыі ў сферы культуры. Гэта буйны адукацыйны, культурна-асветны і навукова-даследчы цэнтр краіны. Мэтай яго дзейнасці з'яўляецца падрыхтоўка спецыялістаў для ўсіх галін культуры. Універсітэт вядзе вялікую мастацка-творчую рабо- ту, развівае і выхоўвае адораных і таленавітых юнакоў і дзяўчат.

У сваім станаўленні універсітэт прайшоў некалькі этапаў. Установа ўзнікла ў 1975 г. як Мінскі інстытут культуры. У першыя гады дзейнасці пад- рыхтоўка кадраў вялася толькі па дзвюх спецыяльнасцях. У 1993 г. інстытут быў пераўтвораны ў Беларускі універсітэт культуры, у 1999 г. ён атрымаў статус вядучай ВНУ ў нацыянальнай сістэме адукацыі ў сферы культуры, у 2001 г. прайшоў дзяржаўную рэгістрацыю і быў перайменаваны ў Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры, а з 2004 г. універсітэт носіць сённяшнюю назву: Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацтваў.

За кароткі час універсітэт з неперспектыўнай, малапрофільнай, вузкагал- іновай установы ператварыўся ў навукова-педагагічны, культурны цэнтр падрыхтоўкі спецыялістаў па 16 спецыяльнасцях і 47 спецыялізацыях для са- цыякультурнай сферы краіны. Высокапрафесійны выкладчыцкі састаў дае магчымасць універсітэту рыхтаваць спецыялістаў вышэйшай кваліфікацыі, якія спалучаюць глыбокія спецыяльныя веды з дасканалай гуманітарнай падрыхтоўкай.

Двойчы універсітэт наведваў Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь А. Р. Лука- шэнка, у выніку чаго значна ўмацавалася матэрыяльна-тэхнічная база: уні- версітэту перададзены Маладзёжны тэатр эстрады, Галерэя ў Палацы Рэс- публікі, будынак пад другі вучэбны корпус. Універсітэт рэгулярна наведва- юць Міністр культуры У. Ф. Матвейчук, Міністр адукацыі А. М. Радзькоў, віцэ-прэм'ер А. М. Косінец.

Сучасная структура падрыхтоўкі кадраў для сацыякультурнай сферы ва універсітэце адпавядае сучасным патрабаванням. Яна ўключае наступныя ступені: падрыхтоўчыя курсы і падрыхтоўчае аддзяленне; вышэйшую адука- цыю I ступені; вышэйшую адукацыю II ступені (магістратура); падрыхтоўку ў аспірантуры; падрыхтоўку ў дактарантуры.

У структуру БДУ культуры і мастацтваў уваходзяць 6 факультэтаў (факультэт культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці, факультэт трады- цыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва, факультэт музычнага мастацтва, факультэт інфармацыйна-дакументных камунікацый, факуль- тэт завочнага навучання, факультэт павышэння кваліфікацыі і перапад- рыхтоўкі кадраў), 20 спецыяльных і 5 агульнауніверсітэцкіх кафедраў, навукова-даследчы аддзел, навукова-творчыя лабараторыі і іншыя пад- раздзяленні і службы. Па хадайніцтву Гомельскага аблвыканкама на базе Мазырскага музычнага вучылішча быў адкрыты філіял факультэта завоч- нага навучання. За 30 гадоў існавання больш за 20 тыс. спецыялістаў атрымалі дыпломы універсітэта. Яго выпускнікі шмат у чым спрыяюць вырашэнню кадравых праблем клубных установ у рэгіёнах краіны. А праблем гэтых багата.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

У клубах працуюць толькі 20 % спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй, а ў тэатрах і музычных установах — 60 %, бібліятэчных установах — 40 %. Уся- го ў галіне 87,4 % спецыялістаў маюць вышэйшую і сярэднюю спецыяльную адукацыю, 12,6 % — спецыяльнай адукацыі не маюць. На вырашэнне кадра- вых праблем у сферы культуры скіравана галіновая праграма «Кадры куль- туры: 2006 — 2010 гады», якая зацверджана рашэннем калегіі Міністэрства культуры ад 20.10.2005 г. № 91, а таксама галіновая праграма «Захаванне і развіццё культуры Рэспублікі Беларусь на перыяд 2006 — 2010 гг.»

Рэалізацыя праграмы павінна забяспечыць:

— павышэнне колькаснага і якаснага паказчыкаў кадравага забеспячэн- ня ўстаноў галіны;

— задавальненне патрэбнасцей устаноў культуры ў кваліфікаваных кадрах;

— павелічэнне колькасці замацаваных маладых спецыялістаў ва ўстано- вах культуры рэгіёнаў;

— удасканаленне структуры падрыхтоўкі кадраў;

— атрыманне вышэйшай адукацыі ў скарочаныя тэрміны навучання для асоб, якія маюць сярэднюю спецыяльную адукацыю;

— павышэнне педагагічнага майстэрства выпускнікоў, удасканаленне методык выкладання;

— выяўленне і стымуляванне маладых талентаў, павышэнне якасці пад- рыхтоўкі спецыялістаў;

— распрацоўку адукацыйных стандартаў, вучэбных планаў і метадыч- ных матэрыялаў для ВНУ і ССНУ культуры;

— павышэнне кваліфікацыі кадраў.

Значная роля ў рэалізацыі галіновай праграмы належыць і БДУ культу- ры і мастацтваў. Сярод праблем, якія звязаны з падрыхтоўкай спецыялістаў галіны і патрабуюць напружанай працы выкладчыцкага саставу універсітэ- та, вылучаюцца наступныя:

— нізкі ўзровень забяспечанасці галіны кадрамі з вышэйшай адукацыяй у рэгіёнах;

— невыкананне планавых заданняў мэтавай падрыхтоўкі спецыялістаў;

— захаванне высокай запатрабаванасці ў кадрах па некаторых спецыяль- насцях (напрыклад, «харэаграфічнае мастацтва», «рэжысура» і інш.);

— стварэнне эфектыўнай сістэмы замацавання маладых спецыялістаў на працоўных месцах;

— стварэнне вучэбных комплексаў «каледж-універсітэт», аптымізацыя падрыхтоўкі кадраў па скразных вучэбных планах і інш.

Названыя праблемы знаходзяцца ў цэнтры ўвагі адміністрацыі і педага- гічнага калектыву універсітэта, прымаюцца меры па іх вырашэнні.

Падрыхтоўка спецыялістаў ва універсітэце вядзецца не толькі на бюд- жэтнай, але і на платнай формах навучання. Усяго ва універсітэце больш за 4000 студэнтаў і слухачоў, з іх 42 % — на платнай форме навучання. На фа- культэце музычнага мастацтва 17 % студэнтаў навучаюцца на платнай фор- ме навучання, на факультэце культуралогіі і сацыякультурнай дзейнасці — 55 %, на факультэце традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мас- тацтва — 30 %. На факультэце павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кадраў навучанне слухачоў з'яўляецца платным.

На факультэце культуралогіі і сацыяльнай культурнай дзейнасці падрых- тоўка кадраў вядзецца па спецыяльнасцях «культуралогія», «сацыяльная пе- дагогіка», «сацыяльная работа», «мастацтвазнаўства». У 2006 г. выпуск па названаму

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

факультэту склаў 81 чалавек, але колькасць бюджэтнікаў, якія падлягалі размеркаванню, крыху большая за палову — 54 %. Усе яны, за выключэннем ільготнікаў, былі працаўладкаваны, у тым ліку ў сельскія ўста- новы культуры — 42,5 % выпускнікоў.

На факультэце традыцыйнай беларускай культуры і сучаснага мастацтва падрыхтоўка кадраў вядзецца па спецыяльнасцях «дэкаратыўна-прыклад- ное мастацтва», «акцёрскае мастацтва», «рэжысура», «харэаграфічнае мас- тацтва», «народная творчасць», «літаратурная работа». Выпуск спецыялі- стаў па названаму факультэту склаў 112 чалавек, у тым ліку 74 % бюджэтні- каў, якія атрымалі першае працоўнае месца. З іх 30 % уладкаваліся на працу ў сельскія ўстановы культуры.

На факультэце музычнага мастацтва падрыхтоўка кадраў вядзецца па спецыяльнасцях «дырыжыраванне», «духавыя інструметы», «спевы», «мас- тацтва эстрады», «народная творчасць». У 2006 г. выпуск склаў 87 чалавек, у тым ліку 86 % бюджэтнікаў, з іх 44 % размеркаваны ў сельскія ўстановы культуры.

Сёння перад універсітэтам стаяць адказныя задачы: не толькі падрыхта- ваць высокакваліфікаваных спецыялістаў, размеркаваць іх ва ўстановы галі- ны, але і забяспечыць іх працаўладкаванне па месцы размеркавання і аргані- заваць суправаджэнне дзейнасці маладога спецыяліста на працягу першых двух гадоў працы. Калі прааналізаваць выпуск спецыялістаў ва універсітэце за мінулыя 5 гадоў, то выразна відаць, што універсітэт выпусціў 1882 бю- джэтнікі, якія падлягалі размеркаванню, і 487 — на платнай аснове. Усе бю- джэтнікі былі размеркаваны на працу, за выключэннем 93 спецыялістаў, якія мелі льготы. Колькасць тых, хто не даехаў ці не замацаваўся на месцы раз- меркавання, мае тэндэнцыю да скарачэння. Так, у 2000 г. не пацвердзілі пры- быццё да месца размеркавання 58 чалавек, у 2005 г. — 11 чалавек, у 2006 г. — толькі 3 чалавекі.

Калі прааналізаваць размеркаванне спецыяшстаў дзённай формы наву- чання 2006 г. па рэгіёнах, то карціна будзе наступнай: у г. Мінску засталіся на працу 13 % выпускнікоў, у Мінскую вобласць паехалі 21 %, у Брэсцкую — 7 %, у Віцебскую — 7 %, у Магілёўскую — 6 %, у Гродзенскую — 4 %, у Го- мельскую — 4 %, і 38 % выпускнікоў размеркаваны ў іншыя ўстановы (рэс- публіканскія). Выпускнікі факультэта завочнага навучання, якія сумяшча- юць навучанне з работай, прадстаўлялі рэгіёны наступным чынам: 6 % — з Віцебскай вобласці, 9 % — з Брэсцкай, 10 % — з Гомельскай, 14 % — з Магі- лёўскай, 17 % — з Гродзенскай, 44 % — з Мінскай вобласці.

Павышэнне кваліфікацыі і перападрыхтоўка кадраў для галіны на адпа- ведным факультэце універсітэта вядзецца па 10 спецыяльнасцях. Усе слуха- чы вучацца на платных умовах і размеркаванню не падлягаюць.

Што ж з'яўляецца прыярытэтам у вырашэнні кадравых праблем галіны для універсітэта ў апошні час? Гэта размеркаванне спецыялістаў з улікам патрэбнасцей галіны, замацаванне іх на месцах, суправаджэнне маладых спецыялістаў на працягу двух гадоў. У гэтым годзе Пастановай Савета Міністраў зацверджана Палажэнне аб вяртанні сродкаў у рэспубліканскі бюджэт, якія затрачаны на падрыхтоўку спецыяліста. Тым самым з'явіўся інструмент прамога ўздзеяння на выпускнікоў, якія навучаліся за дзяржаў- ныя грошы, але адмаўляюцца працаваць па месцы размеркаваня. Гэта пы- танне знаходзіцца пад кантролем Камітэта Дзяржкантролю, Пракуратуры, міністэрстваў культуры і адукацыі. Прынятыя меры дазволілі ў бягучым го- дзе скараціць колькасць не прыбыўшых да месца размеркавання да трох ча- лавек.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Ва універсітэце створана пастаянна дзеючая камісія па размеркаванню выпускнікоў, якая актыўна займаецца прафарыентацыйнай работай, пад- трымлівае сувязі з абласнымі ўпраўленнямі і раённымі адзеламі культуры: універсітэт інфармуе аб графіках размеркавання выпускнікоў, аб якаснай і колькаснай іх характарыстыках, аб мэтавым прыёме ў бягучым годзе, аб месцах праходжання пераддыпломнай практыкі, вывучае попыт на спецыя- лістаў і збірае заяўкі.

На калегіі Міністэрства культуры разглядалася праблема мэтавай пад- рыхтоўкі спецыялістаў. Адзначалася слабая падрыхтоўка кандыдатаў на мэ- тавыя месцы з Брэсцкай, Гродзенскай, Магілёўскай абласцей, указвалася на адсутнасць конкурсу па мэтавым прыёме на такія спецыяльнасці, як «Харэа- графічнае мастацтва», «Спевы», «Дырыжыраванне», «Сацыяльная работа», «Літаратурная работа», «Музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны». У гэтым годзе 8 чалавек, якія прэтэндавалі на мэтавыя месцы, атрымалі незадавальняючыя адзнакі. Універсітэт працягвае работу з аблас- нымі ўпраўленнямі культуры па вырашэнню гэтай праблемы.

Асаблівая ўвага надаецца размеркаванню выпускнікоў у сельскую мяс- цовасць, у аддаленыя рэгіёны Беларусі, у аграгарадкі. Тым самым універсі- тэт робіць свой уклад у рэалізацыю Дзяржаўнай праграмы развіцця вёскі.

З мэтай павелічэння выпуску спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй уні- версітэт працягвае работу па стварэнню вучэбных комплексаў «каледж-уні- версітэт». З улікам назапашанага вопыту супрацоўніцтва з Гродзенскім і Мінскім абласнымі каледжамі мастацтваў распрацоўваецца макет скразнога плана для ўсіх ССНУ культуры і мастацтва рэспублікі і універсітэта. Рэаліза- цыя праекта дазволіць рыхтаваць спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй у скарочаныя тэрміны.

Актуальнай з'яўляецца праблема навуковай падтрымкі падрыхтоўкі спе- цыялістаў. Для вырашэння гэтай праблемы неабходна сумесна з Беларускім інстытутам праблем культуры распрацаваць мадэлі падрыхтоўкі сучасных спецыялістаў, удакладніць іх функцыянальныя абавязкі, прапанаваць змены ў штатным раскладзе клубных устаноў новага тыпу ў адпаведнасці з пералі- кам спецыяльнасцей і спецыялізацый, па якіх вядзецца падрыхтоўка кадраў.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ